Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і літаратуры ў школе і ВНУ: зб. навук. арт. / пад рэд. Л.А. Мурынай. – Мінск: БДУ, 2005. – Вып. 4. – С. 76

***В. У. Праскаловіч***

# ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ НАВУЧАННЯ Ў ШКОЛЕ І ВНУ

Ва ўсіх цывілізаваных грамадствах адукацыя грунтуецца на нацыянальна-культурным падмурку. Гэта пацвярджаецца і Законам "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь", дзе ў якасці  аднаго з асноўных прынцыпаў названа нацыянальна-культурная аснова. Навучальная парадыгма з апорай на этнакультуру, на фальклор як сродак адукацыі – унікальная справа. Адметнасць нацыянальных сістэм адукацыі ў рэспубліках былога СССР у асноўным вызначалася наяўнасцю ў вучэбных планах прадметаў нацыянальна-культурнай спецыфікі (найперш мовы і літаратуры). Сёння тагачасная традыцыя крытыкуецца вядучымі спецыялістамі расійскай педагогікі (Б. С. Гершунскі, В. І. Загвязінскі, Б. Т. Ліхачоў, З. А. Малькова і інш.). Яны вымушаны прызнаць: "Сучасныя педагагічныя рэаліі патрабуюць, з аднаго боку, улічваць у адукацыі этнакультурны фактар, з другога – ствараць умовы для пазнання культуры іншых народаў, выхавання талерантных адносін паміж людзьмі, якія належаць да розных этнасаў, канфесій, рас" [1, с. 4]. Уводзяцца нават паняцці *"этнасфера чалавека"* (нацыянальна-культурнае асяроддзе чалавека), *"ментальныя каштоўнасці"* (нацыянальна-культурна-псіхалагічныя каштоўнасці), якія, аказваецца, павінны быць прадстаўлены ў змесце адукацыі дзеля развіцця асобы і адраджэння нацыянальных культур.

Метадалагічнае абгрунтаванне неабходнасці пераводу беларускамоўнай адукацыі на асновы этнакультурнай ідэнтыфікацыі даў у сваіх працах прафесар В. У. Протчанка. У выніку шматгадовых даследаванняў доктар педагагічных навук В. У. Протчанка прыйшоў да надзвычай важнай для навукі і практыкі высновы: пабудова і станаўленне нацыянальнай школы патрабуюць адпаведнай падрыхтоўкі педагагічных кадраў. У сувязі з гэтым вучоны ўказвае, што "выкладчыку методыкі неабходна таксама клапаціцца аб тым, каб гады вучобы ў педагагічна арыентаванай установе сталі непарыўным мэтанакіраваным працэсам фарміравання асобы настаўніка, носьбіта новых ідэй, здольнага ўкараняць у практыку работы школы перспектыўныя метадычныя падыходы, лепшыя ўзоры прафесійнай дзейнасці, навучыць рэалізаваць сучасныя методыкі" [2, с. 49]. З улікам гэтага ў працэсе падрыхтоўкі будучых настаўнікаў важнае месца павінна заняць новая адукацыйная парадыгма, распрацаваная на аснове больш цеснай інтэграцыі існуючай філасофіі навучання і выхавання з этнакультурай. Будучыя выхавацелі, настаўнікі павінны быць глыбока дасведчанымі ў

пытаннях педагагічнай культуры свайго народа, умець на практыцы выкарыстоўваць народныя педагагічныя набыткі, якія выверaны жыццём і часам.

Ідэі народнай педагогікі прыцягальныя тым, што яны заснаваны не на абстрактных тэорыях, якіх так багата ў нашай педагагічнай навуцы і якія не знайшлі прымянення на практыцы, а на вопыце народа, у скарбніцы якога шмат паэзіі, мудрасці, геніяльнай прастаты. З гэтай нагоды К. Дз. Ушынскі пісаў: "Выхаванне, створанае самім народам і заснаванае на народных пачатках, мае тую выхаваўчую сілу, якой няма і ў самых лепшых сістэмах, заснаваных на абстрактных ідэях або запазычаных у другога народа" [3, с. 161].

Стагоддзямі назапашаны народны вопыт выхавання можа даць настаўніку даволі выразнае ўяўленне аб іерархіі каштоўнасцей грамадства, рэкамендацыі па фарміраванні падрастаючага пакалення.

Народ выпрацаваў мноства парад-павучанняў па выхаванні дзяцей. Так, у народнай педагогіцы існуе сцвярджэнне пра неабходнасць як мага раней пачынаць выхаванне дзіцяці: *"Не навучыш слухаць маленькім, не паслухае, калі барада вырасце"*, *"Хто да чаго прывыкне замаладу, то й на старасці не пакіне"*. На думку народа, справа выхавання – вельмі няпростая і цяжкая праца: *"Пускаць на свет лёгка, ды на ногі ставіць цяжка"*, *"Дзетак узгадаваць – не курак пасклікаць"*. Каб дасягнуць поспехаў у выхаванні, людзі па-рознаму ўздзейнічаюць на выхаванне ў залежнасці ад сітуацыі, выбіраючы кожны раз той ці іншы спосаб, свой метад выхавання. Як зазначае Г. П. Арлова, "у народнай педагогіцы можна вылучыць шмат метадаў выхавання: праца, прыклад і аўтарытэт, назіранне, гульня, наказ, перакананне, парада, тлумачэнне, гутарка, спаборніцтва, практыкаванне, грамадская думка, заахвочванне і ўхваленне, благаславенне, асуджэнне і інш." [4, с. 16]. Але ж выкарыстанне гуманных метадаў – аснова выхавання дзяцей у беларускіх сем’ях: *"Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі"*, *"Не біце дубцамі, навучайце слаўцамі"*, *"Куляй пацэліш у аднаго, двух, а трапным словам – у тысячу"*.

У працэсе выхавання дзяцей беларуская народная мудрасць асаблівую ролю адводзіць сям'і, бацькам, найперш – маці. Народ заўважае: *"У каго маці родненька, у таго сарочка беленька"*, *"Маці сама не з’есць, а дзіця накорміць"*. Самая жорсткая крыўда для маці – знявага яе дзіцяці: *"Узяў дзіця за руку, матку бярэш за сэрца"*. Мудры народ заклікае берагчы маці: *"Беражы маці, яна не будзе век целепаці"*, *"Няма тых лавак, дзе купляюць родных матак"*, *"Усяго за грошы купіш, апроч бацька-мацеры"*.

Фальклор выразна крышталізуе ўяўленні беларускага народа аб уплыве сямейных асноў на фарміраванне дзіцяці: *"Дзе ў сям'і лад, там і дзеці добра гадуюцца"*, *"Якое дрэва, такі клін, які бацька, такі сын"*, *"Якая матка, такое й дзіцятка"*, *"Няма чаму дзівавацi, такая была і маці"*. Маральны прыклад і

аўтарытэт бацькоў – аснова сямейнага выхавання: *"Харошых бацькоў – харошыя дзеці", "Добрага бацькі – добрыя дзеці, ліхога – ліхія".*

У беларускай народнай педагогіцы прадстаўлены і аксіялагічныя аспекты праблемы маральнага выхавання дзяцей. Беларуская народная мудрасць дапамагае настаўніку лепш зразумець змест маральнага выхавання, яго прынцыпы і метады, у аснове якіх ляжаць гуманістычныя ідэалы: вера ў магчымасць маральнага ўдасканалення чалавека, патрабаванне павагі да чалавека і стварэнне ўмоў, неабходных для развіцця асобы. Беларускі народ лічыць чалавечнасць галоўнай маральнай якасцю асобы, разглядае яе шырока, уключае ў паняцце чалавечнасці іншыя маральныя якасці – паважлівыя адносіны да людзей: *"Шануй людзей, то і цябе пашануюць", "Бацькоў любі, старых паважай", "Старэйшых і ў пекле шануюць"*; добразычлівасць і чуласць: *"Чаго сабе не хочаш, таго і другому не зыч", "Шчыраму сэрцу чужая болька баліць"*; сумленнасць і праўдзівасць: *"Гаварылі за вочы – гаварыце і ў вочы", "Праўда грубая, ды людзям любая", "Не той чалавек, што грошы мае, а той чалавек, што няпраўды не мае"*; самаахвяраванне і любоў: *"Пажыві для людзей, пажывуць і для цябе", "Любі другога, як сябе самога"* і г. д.

Для выпрацоўкі ў падрастаючага пакалення правільнай маральна-каштоўнаснай арыентацыі і выхавання гуманізму народ карыстаецца разнастайнымі сродкамі і метадамі. Найбольш дзейснае і эфектыўнае – асуджэнне бесчалавечнасці: *"Чалавечына! Адна душа ў боце, другая ў жывоце, а трэцця па свеце ходзіць да людзей зводзіць", "На свет лепш не радзіцца, ніж ліхім чалавекам быць".*

Не менш яскрава праяўляюцца каштоўнасныя арыентацыі народнай педагогікі ў справе патрыятычнага выхавання. У аснове патрыятычнага выхавання дзяцей – выхаванне любові да Радзімы, да роднай зямлі і дому, да прыроды, да маці. Прыклад і аўтарытэт бацькоў вяршэнствуюць у патрыятычным выхаванні. Народ вучыць: *"Бацькоў не цурайся, а ад Радзімы не адракайся", "Хто роднага краю цураецца, той і маткі сваёй адцураецца", "Хто мову і веру мяняў, той не толькі сябе, а і маці прадаў"* і інш. Неад'емнай часткай і дзейсным сродкам патрыятычнага выхавання з'яўляюцца прыказкі і прымаўкі, легенды і паданні, казкі і песні.

Народны вопыт патрыятычнага выхавання можа быць карысным настаўніку і ў педагагічнай прафесійнай арыентацыі.

Такім чынам, беларуская народная педагогіка ўключае ў сябе сістэму каштоўнасных паняццяў, уяўленняў, поглядаў, якія маюць шмат агульнага з агульначалавечымі каштоўнасцямі. Менавіта "этнапедагогіка дапамагае ўзняцца да вяршынь агульначалавечых маральна-духоўных каштоўнасцей, якія, у сваю чаргу, узялі ўсё лепшае з этнічных скарбніц кожнага народа. Таму толькі праз этнапедагогіку можна пракласці шлях да агульнапланетарнай педагагічнай культуры" [5, с. 12].

Сёння ўжо можна прыняць за аксіёму: этнанацыянальныя культурныя набыткі з'яўляюцца адной з аксіялагічных асноў педагагічнай прафесійнай

падрыхтоўкі выхавацеляў, настаўнікаў, фарміравання ў іх прафесійна-каштоўнасных асобасных якасцей. Як слушна заўважае І. І. Сучкоў, "сапраўдны настаўнік звычайнай школы даўно зразумеў, што вытанчаная тэхналогія сучаснай вытворчасці, абвастрэнне экалагічных, міжнародных і рэгіянальных праблем патрабуюць не толькі багатага культурнага кругагляду, глыбокага ўкрапвання "законаў прыгажосці" ў кантэкст кожнай прафесіі, але і шырокай этнічнай свядомасці, трывалай этнаадукацыі кожнага чалавека незалежна ад яго нацыянальнасці"[6, с. 13]. Такім чынам, карэннае паляпшэнне выніковасці выхаваўчай работы, на нашу думку, бачыцца ў навукова абгрунтаваным выкарыстанні этнанацыянальных культурных традыцый для распрацоўкі канцэпцыі кіравання і арганізацыйных модулей упраўлення этнашколай (новая адміністратыўна-арганізацыйная парадыгма), і на гэтым падмурку – для вырашэння канкрэтных адукацыйных задач – у справе прафесійнай падрыхтоўкі педагагічных кадраў у вышэйшых навучальных установах нашай рэспублікі.

### *Літаратура*


1. *Манаев В. В., Малькова З. А., Супрунова Л. Л.* Поликультурное образование – актуальная проблема современной школы // Педагогика. 1999. № 4. С. 3–10.

2. *Протчанка В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. Мн., 2001.

3. *Ушинский К. Д.* Педагогические сочинения. М.; Л., 1948.

4. *Арлова Г. П.* Беларуская народная педагогіка. Мн., 1993.

5. *Болбас В. С.* Этнічная педагогіка беларусаў // Нар. асвета. 1998. № 8. С. 133–138.

1. *Сучкоў І. І.* Фальклорны тэатр і выхаванне асобы. Мн., 2001.